*Вольга Гапеева*

# «ІНШАЕ ВЫМЯРЭННЕ»: НІЗКА ВЕРШАЎ

•

думаеце, мужчыны разважаюць пра глабальнае ў свеце?

пра тое што ў афрыцы галодныя дзеці?
і што планеце

пагражае знішчэнне?

аказваецца там іншае вымярэнне,
мой мужчына калі я распавядаю яму пра метафізіку ўлады
або феміністкую крытыку мовы
думае выключна пра позы
у якіх ён мог бы мяне кахаць
і позірк ягоны тады вельмі сканцэнтраваны

здаецца, ён думае пра вандроўкі намады

і намадычных суб’ектаў
ці рыхтуе свой аргумент на карысць патрыярхатнай сістэмы
укладаючы ўсё ў архетыпы і міфалагемы
і калі ўзгадаю фуко і дысцыплінаванне цела

ён запытаецца:
*– а ты б хацела*

*каб я цябе дысцыплінаваў пугай?*
ніякіх высокіх матэрый
і квадратур круга
чыстая геаметрыя размяшчэння мяне ў прасторы
механіка цел без сантыментаў і перамоваў

*(з кнігі «Граматыка снегу»)*

**– як не паехаць у венецыю –**

як звыкла і проста спыніцца
і не паехаць у венецыю
можа таму

што ўжо не святкуецца новы год і дзень нараджэння
і паступова ўсё ператвараецца ў будзённасць
якую абачліва не хочацца разбаўляць нічым
асабліва венецыяй
гэта я зразумею пазней
а пакуль мільяна складае далоні і просіць стаць часткаю ейнага падарожжа
як атам я маю маленькі перыяд паўраспаду
таму ўжо праз хвіліну перад удзячнай публікай

я – памяркоўная авантурыстка

я – лянотная геданістка

я – мізантропная эгаістка

я – эмпатыйная феміністка

і ў кожнай мяне – свае аргументы
але я пагаджаюся
і мільяна так шчыра падскоквае ад радасці пасярод вуліцы
што мне робіцца трошку няёмка
за сваю будзённасць і стрыманасць
я таксама хачу хацець у венецыю

і я пачынаю...

...а раптам дарма ўсё гэта

не, не
калі яшчэ выпадзе шанец
шэсць гадзін і ты ў венецыі
і біенале вапарэта джэлата
квіткі і гатэлі
паўла
даносіцца прысмак мора
непразрыстасць паветра дзе выспа хаваецца ў марыве
але ўсё што я магу прыгадаць гэта томаса мана
з ягонай смерцю ў венецыі
хоць зусім і не ведаю што раніцай на вакзале

нам скажуць:

– квіткоў да венецыі не засталося.
відаць мая будзённасць прыдбала апошні

*(з кнігі «Граматыка снегу»)*

•

ніколі не думала што так цяжка насіць сукенку
спадніцу абцасы каралі
і не ператварыцца ў калядную елку
ці ператварыцца і не звяртаць увагі
гэта сапраўды цяжка
быць упісанай у цела
якое магчыма і не хацела
каб я ў яго была ўпісана
і менавіта так апранала
як апранаю

можа яно хацела стаць больш бачным для навакольных
і пэўна на мае кашулі вольнага крою
злуецца
а я злуюся ў адказ
забываючыся што кожная з нас
ці кожны
быў голым народжаны
ці была...

у калідоры перад люстэркам
узгадваю вачыма ўсё што з намі было
і яно
глядзіць на мяне панура
бо сёння зноў не тое я апранула

*(з кнігі «Граматыка снегу»)*

•

ты запытаешся ці падабаюцца мне барадатыя людзі

чаму людзі? – падумаю я
можа ты баішся што я не лічу мужчын за людзей

(і таму іх так называеш?)
або слова мужчына занадта небяспечнае

каб пісаць яго з такімі словамі як “падабацца” і “мне”
раптам я выяўлюся дзяўчынай
і ты пабачыш ува мне асобу жаночага полу і табе стане

няёмка пісаць мне пра свой гастрыт
а я не змагу больш канцэнтравацца на словах
і стану сачыць за тым як перасоўваюцца твае вусны
церучыся адна аб адну
можна я цябе перакладу
на зразумелую для мяне мову

...але гэта не пра бараду

што я ведаю пра бароды?
напэўна як і пароды
яны сустракаюцца розныя
артэрыяльныя і венозныя

не, гэта пра кроў а трэба пра бараду

лепей напішу ў адказ пытанне:

"а барадатыя людзі цалуюцца ў ваннай?"

*(з кнігі «Граматыка снегу»)*

•

джым, якая рамантыка

тут мінус 8 глінтвейн не грэе
на плошчы паставілі елку
не думала што такія бываюць
падрыхтоўка да свята за некалькі месяцаў
быццам так будзе прасцей паверыць
у цуд на каляды і святога міколу
або дзеда мароза

ці нават снягурку, хаця калі справа даходзіць да веры
жанчыны выключаюцца з пачэснага шэрагу

і сапраўды чаго ў іх верыць? былі сабе і былі
а не было ну і годзе
бо са стагоддзя ў стагоддзе
гузік старанна прышыты да кашулі жаўнера
стужка адпрасаваная на безбрылёўцы матроса
не ствараюць гісторыі
а ўсяго толькі жыццё асобнага чалавека ці двух
якія паміраючы ўзгадвалі не эпас падзей
а шурпатасць сколатых пальцаў

дробныя валдыры ад апёкаў на прыдалонні
тых самых нязначных людзей
ад якіх нішто не залежала і гэтак жа нічога не засталося

*(з кнігі «Граматыка снегу»)*

**– верш пра слана –**

у парку горкага калі ўсе спяць
уздоўж ракі ля ліхтара таўчэцца слон
ён выправіўся быў на мацыён
сярод туману

трысціну захапіў і капялюш прыстойны
і ўжо гатовы распачаць паважную размову
быў

але маўчаць у адказ – бо ўсе пакуль што спяць
сярод туману

і сняць слана ў каўнерыку гішпанскім пасярод арэны
чакае публіка на сальта і на піруэты
каб не скончалася здзіўленне і казытала ў горле
ад нечаканых поз

а ён сумліва вушы апусціў
і стоячы на тумбе прыкрывае вочы
дэманстраваць не хоча
салёны іхні бляск

я зразумець спрабую часам
сярод туману
дзе ёсць рэальнасць а дзе сон
паміж якімі балансуе слон

*(з кнігі «Граматыка снегу»)*

……

калі б я жыла ў годзе 1908
я была б эмэлін панхёрст і хадзіла б на дэманстрацыі
і мажліва знайшлі б у маіх грудзёх
нешта накшталт пухліны
жоўтай такой і з бронзы
і нейкі мужчына, разгарнуўшы назаўтра газэту
падумаў бы
яна проста апынулася ня ў той час
ды й ня ў тым месцы
наіўна спадзеючыся перарадзілася б я ў соню
і днямі перапісвала б раманы свайго геніяльнага мужа
перастаўляючы месцамі словы для мілагучнасьці
і словы б мяне любілі і шкадавалі і думалі б
яна ня ў тым месцы і ня ў той час апынулася

нарадзіўшыся тут і цяпер
я апранаю спадніцу ці нагавіцы
часам – радасьць
але збольшага – думку што
гэта ня час і ня месца
а той мужчына і тая газэта, той журналіст і ягоны рэдактар
шкадаваньне, словы, пухліны, раманы і геніі
і можа быць нават туга заціснуты корак

неяк ты запытаўся калі б мела два шансы на выбар
дзе і кім нарадзіцца
што б я абрала

абрала б адказ каб табе спадабацца
зьдзівіць але што тут прыдумаць
мне адмоўлена ў выбары
магу распавесьці праўду

быць селянінам кітайскім у стагодзьдзі дванаццатым
пасьвіць жывёлу і думаць пра небясьпеку
часам пра міску з лапшой гарачай

ня тое што ты – нью-ёрк пачатак стагодзьдзя джаз

выбар гэта
ня час і ня месца
а нешта больш дробнае
кротнае майму існаваньню

напрыклад – існаваньне тваё

*(з кнігі «Прысак і пожня»)*

**п'еса «The Portrait of the Artist as a Young Bitch»**

*no is not in dog's vocabulary*
Nora Gomringer

я твой верны сабачка
паддаюся дрэсуры
машу хвастом
магу нават стаць на заднія лапкі
ці хадзіць на дыбачках
я так люблю калі ты выводзіш мяне на шпацыркі
але глядзі каб я ня звыклася з прыемным
а то яшчэ чаго добрага ахамею
і забудуся на сваё месца
так, так, салодкія косткі толькі па сьвятах
а лепш абмяжуемся днём народзінаў
ты ўжо прыдумаў калі ён?
хоць можа так стацца што твае вялікія грандыёзныя пляны
ці праца будуць стаяць паміж намі
ня страшна
скручуся калачыкам на каберцы і буду чакаць
што? я зашмат тут скуголю? брашу? я сука?
а хочаш…
ты ня хочаш каб я была тваім верным сабачкам?
ты ня хочаш каб я была сабачкам?
ты пачаў улоўліваць нешта крыўднае ў слове сабачка
людзі на цябе скоса глядзяць?
кажуць гэта не гуманна трымаць мяне на ланцугу?
ты што, гэта абсалютнае глупства
мой ланцуг самае дарагое што падарыла жыцьцё
а дакладней ты
я цяпер назаўсёды застануся з табой

каму ж я яшчэ патрэбная
асабліва з распоратым жыватом
ууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууууу

(нехта вые)

заслона

*(з кнігі «Прысак і пожня»)*

**маналёг адной кніжкі**

ты паставіў мяне кудысьці далёка ў шафу
паміж іншымі шмальцаванымі кніжкамі
каб я ведала сваё сапраўднае месца
і не рабіла тут зь сябе
прынцэсу
я расплюшчваю вочы і бачу
што мне стала цесна
недзе далёка ў шафе
сярод іншых таўстацелых кніжак
я чакаю дотыку тваіх пальцаў
таму што чытач гэта такі бог
ён выбірае з кім правядзе сёньня ноч
пашчасьціла нарадзіцца прыгожай – можаш стаць любай
ці нават настольнай
а не – прастаіш і пакрыесься пылам стагодзьдзяў
такі незайздросны лёс кніжны
цябе выбіраюць і набываюць потым мяняюць на іншыя
ці проста калекцыянуюць
але гэта нармальна таму што ты – рэч
і як кожная добрая рэч мусіш годна служыць:
забаўляць, адукоўваць, выхоўваць дзяцей ці гатаваць смачныя стравы
у адваротным выпадку
зьнясуць цябе ў макулатуру
ці растопяць крый божа печку
здадуць у бібліятэку і зробісься ты тады
публічнаю кніжкай бяз дому
якую бяруць на тэрмін за грошы
а потым вяртаюць ці недзе губляюць

у месцах грамадзкіх
такі небясьпечны лёс кніжны
але гэта нармальна таму што ты – рэч
таму што ты – слова
зь няправільным граматычным родам

*(з кнігі «Прысак і пожня»)*

## ,

маці якія нарадзілі паэтак
маці якія нарадзілі паэтаў
пра гэта не ведалі
думалі што дзіцятка іхняе будзе
чалавекам прыстойным
нармальным
шчаслівым
у скрайнім выпадку – акторкай
маці якія нарадзілі паэтак
выхоўвалі іх як умелі
кармілі паілі запляталі ім коскі прасавалі сукенкі
ніколі не абдымалі і пыталіся адно “ці паела?”
у доме маці паэтак нельга было прараніць і слязінкі
чаго ты румзаеш, у цябе нехта памёр?
пыталіся там
і паэткі ішлі да дрэваў, да ліфтаў, да словаў каб плакаць без сведкаў
радзіма маці паэтак – спарта
цела маці паэтак – са сталі,
моцныя людзі стрываюць усё, жалезныя нервы, жалезная воля
сюсьлі-мюсьлі пяшчоты і пеставанні – для хлюпікаў
якім невядомая сіла металу

маці якія нарадзілі паэтаў
даглядалі іх як умелі
на абед пакідалі згарэлыя стравы, аддавалі каманды, запіралі дома
і прымушалі маліцца богу рацыянальнасці
у доме маці паэтаў нельга было весяліцца
бо толькі сур’ёзныя справы робяць людзей людзьмі
забаўкі і гульні для ідыётаў
маці паэтаў родам з краіны цмокаў
быць маці паэткі і маці паэта

безабаронна і небяспечна
аднойчы ўсё перакуліцца долу,
ідыёты стануць вядомымі
рахманыя плаксы – зоркамі
і абавязкова напішуць верш
пра тую што іх нарадзіла
карміла паіла і абувала
як класікі пішуць
вядома ж лепшай долі жадала
у свеце жалеза і сталі
дзякуй, скажуць паэткі
дзякуй, адгукнуцца паэты
і зменяць планету

**,**

*But sometimes you get crazy like a woman*

дарагі мой, каханы
мне ніколі не стаць мужчынам
не магу і жанчынай я быць
і не быць ёй я не магу
я лунаю паміж ролямі
не ўпэўненая ў сваёй ідэнтычнасці
і таму з радасцю давяраюся любой прапанове:
магу быць гітарай – але ты ж не граеш
магу быць патэльняй – але ж ты так сабе кухар
магу быць ваннай – але ты не любіш эратычных успамінаў
таму быць ложкам таксама няма мне сэнсу
можа мне стаць кашэчым латком? – катоў ты любіш і песціш і адказваеш на іх просьбы
хаця не, чакай, самым неабходным і любым,
той каму ты ніколі не здрадзіш не сыдзеш і застанешся верным
будзе
канешне ж твой
унітаз
сядай мой каханы
уладкоўвайся зручна
кідай усё лайно ў мяне
можаш і падрачыць калі трэба
на тую, што ты сапраўды “кахаеш”

я ж разумею унітазы не для кахання
яны для іншага так бы мовіць
тваё грамадства вучыла добра

пульхныя азадкі на маім твары
ці гэта тое чаго я хацела?

*Хіле, Кім, Крысціне, Ліндзе, Марыі, Мод, Нурдуран*

калі пяць жанчын чытаюць са сцэны свае вершы
шостая сядзіць праваруч
сёмая наперадзе
я нарэшце адчуваю сябе ў бяспецы
і што гэтая выпадковасць не выпадковасць зусім
а доўгая балючая праца стагоддзямі тых хто верылі ў сябе
калі не верыў ніхто
і гэты ніхто дагэтуль сядзіць сярод нас
але нас ужо восем
і мне не вусцішна
болей